Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
______________Ю. П. Бондар
«____»_____________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя);*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 Інструментальная музыка духавая*

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнік**

*А. Л. Карацееў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*П. Ф. Дударэнка,* першы прарэктар установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», дацэнт;

*В. М. Ушакова,* прафесар кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар педагагічных навук, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 20.09.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*

Адказны за выпуск *А. Л. Карацееў*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» для студэнтаў музычных спецыяльнасцей з’яўляецца адной з асноўных у працэсе прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Курс накіраваны на фарміраванне ў студэнтаў навуковых уяўленняў у галіне методыкі выкладання спецыяльных музычных дысцыплін і забяспечвае набыццё комплексу ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для атрымання кваліфікацыі «выкладчык». У сістэме спецыяльнай педагагічнай падрыхтоўкі музыканта дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» выконвае асобую функцыю. Яна дазваляе не толькі сфарміраваць комплекс ведаў аб мэтах, задачах, змесце і тэхналогіі навучання музыканта, але і вывесці на новы ўзровень абагульнення шматаспектны працэс фарміравання будучага спецыяліста як творчай асобы.

Дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» непарыўна звязана з цыклам агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, а таксама шэрагам дысцыплін спецыялізацыі. Выкладанне дысцыпліны абапіраецца перш за ўсё на веды, атрыманыя студэнтамі пры вывучэнні дысцыплін «Педагогіка», «Псіхалогія», «Гісторыя мастацтваў», «Сальфеджыа і тэорыя музыкі (гармонія, поліфанія, аналіз музычных форм)», «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Аркестравы клас», «Камерна-інструментальны ансамбль», «Чытанне аркестравых партытур», «Спецінструмент», «Дырыжыраванне», «Фартэпіяна» і інш. У сваю чаргу веды, уменні і навыкі, якія набыты пры вывучэнні «Методыкі выкладання спецдысцыплін», з’яўляюцца грунтоўным падмуркам плённай выканальніцкай, арганізацыйнай і педагагічнай (адукацыйнай і выхаваўчай) дзейнасці будучых спецыялістаў. На пэўныя раздзелы і тэмы курса студэнты могуць арыентавацца пры абранні тэмы будучай дыпломнай работы.

*Мэта* дысцыпліны – фарміраванне асноў педагагічнага майстэрства па выкладанні спецыяльных музычных дысцыплін.

У *задачы* дысцыпліны ўваходзяць:

– фарміраванне комплексу ведаў, уменняў і навыкаў, якія забяспечваюць магчымасць плённай педагагічнай дзейнасці ў галіне музычнага мастацтва;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– засваенне сучасных прынцыпаў і тэхналогій сучаснай музычнай педагогікі;

– азнаямленне студэнтаў з заканамернасцямі і пэўнымі алгарытмамі, якія складаюць сутнасць методыкі выкладання музычных дысцыплін;

– авалоданне педагагічным рэпертуарам і метадычнай літаратурай;

– развіццё прафесійнага інтарэсу да педагагічнай дзейнасці;

– далейшае ўдасканальванне прафесійных і агульных музычных здольнасцей студэнтаў.

У выніку праходжання курса студэнты абавязаны *ведаць*:

– спецыфічныя асаблівасці выкладання спецыяльных дысцыплін у навучальных установах розных тыпаў, у дзіцячых і дарослых калектывах;

– методыку складання і аналіз вучэбных і канцэртных музычных праграм;

– асаблівасці методыкі работы над музычным творам на розных этапах;

– спецыфіку падрыхтоўкі вучня да канцэртнага выступлення, выканальніцкага конкурсу;

– вучэбны і канцэртны рэпертуар і сучасную метадычную літаратуру;

*умець*:

– выкладаць музычныя дысцыпліны ў прафесійных і агульных установах музычнай адукацыі, выкарыстоўваць пры гэтым традыцыйныя і сучасныя методыкі;

– працаваць з вучэбна-метадычнай літаратурай;

– праводзіць урокі розных відаў і тыпаў;

– вырашаць з вучнем канкрэтныя мастацкія і тэхнічныя задачы;

– планаваць вучэбны працэс з улікам узросту і ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, паслядоўна развіваць у вучня музычныя здольнасці, прафесійныя ўменні і навыкі.

Сярод найбольш эфектыўных агульнапрынятых сучасных педагагічных тэхналогій, якія садзейнічаюць не толькі кіраванню ведамі, але і далучэнню студэнтаў да творчага пошуку і набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных прафесійных задач, неабходна падкрэсліць асаблівую значнасць:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– камунікатыўных тэхналогій (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, дэбаты і інш.);

– іграваых тэхналогій (дзелавыя, ролевыя, імітацыйныя ігры).

З мэтай фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускніка ўніверсітэта ў практыку правядзення семінарскіх і практычных заняткаў мэтазгодна ўключаць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы. Кіраванне навучальным працэсам і арганізацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці забяспечваецца ўкараненнем рэйтынгавай і крэдытна-модульнай сістэм ацэнкі вучэбнай, вучэбна-даследчай і самастойнай дзейнасці студэнтаў, варыятыўных мадэляў кіруемай самастойнай работы студэнтаў і вучэбна-метадычных комплексаў.

Дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» мае практыка-арыентаваны характар і прадугледжвае акрамя лекцый і практычных заняткаў значны аб'ём гадзін на самастойную кантралюемую работу студэнтаў. Яна накіравана на замацаванне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў па дысцыпліне, а таксама на вырашэнне задач і сітуацый, якія імітуюць прафесійныя (педагагічныя) і сацыяльна-асобасныя праблемы і рэалізуецца праз выкананне наступных форм: кантрольныя работы; вучэбна-даследчыя заданні; падрыхтоўка рэфератаў; азнаямленне з навуковай, метадычнай і нотнай літаратурай для спецыялістаў духавога мастацтва; напісанне анатацый па аналізе канкрэтных сітуацый, якія складаюцца ў навучальным працэсе вучэбных устаноў; састаўленне плана работы выкладчыка і індывідуальных планаў навучэнцаў і г.д.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін» прадугледжана ўсяго 80 гадзін, з якіх 26 гадзін – аўдыторныя заняткі (лекцыі – 20 гадзін, семінары – 6 гадзін).

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | семін., практ. | лекцыі |
| **Раздзел I.** ***Тэарэтыка-практычныя асновы методыкі выкладання спецыяльных музычных дысцыплін*** | | | |
| *Тэма 1.* Спецыяльныя дысцыпліны ў сістэме музычнай адукацыі | 2 | 1 | 1 |
| *Тэма 2.* Асноўная вучэбна-метадычная літаратура па спецыяльных дысцыплінах | 11 | 5 | 6 |
| *Тэма 3.* Сутнасць і змест сучасных выканальніцкіх школ | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Дыягностыка і метады развіцця музычных здольнасцей навучэнцаў | 3 | 2 | 1 |
| **Раздзел II.** ***Тэхналагічныя аспекты навучання педагагічнаму і выканальніцкаму майстэрству*** | | | |
| *Тэма 5.* Састаўныя кампаненты выканальніцкага апарату музыканта | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 6.* Методыка засваення асноўных мастацка выразных сродкаў музычнага выканальніцтва | 18 | 10 | 8 |
| *Тэма 7.* Методыка вывучэння і асаблівасці засваення вучэбнага і канцэртнага рэпертуару | 10 | 6 | 4 |
| **Разам ...** | **26** | **6** | **20** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел I. Тэарэтыка-практычныя асновы методыкі выкладання спецыяльных музычных дысцыплін

### *Тэма 1. Спецыяльныя дысцыпліны ў сістэме музычнай адукацыі*

Дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» сярод іншых дысцыплін музычнага цыкла. Роля спецыяльных дысцыплін у падрыхтоўцы спецыялістаў духавога мастацтва Беларусі (гістарычныя і метадычныя аспекты). Вывучэнне спецыяльных дысцыплін як умова якаснай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных выкладчыкаў (вучэбныя навучальныя ўстановы культуры і мастацтваў; мастацкія калектывы ўстаноў культуры і ведамасных устаноў). Формы бягучага і выніковага кантролю, крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў па дысцыпліне «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін». Метадычныя аспекты, змест, асноўныя дакументы і патрабаванні па выкладанні спецыяльных дысцыплін на духавых аддзяленнях ва ўстановах адукацыі, культуры і мастацтваў. Крытэрыі, сістэма і асноўныя формы навучання і кантролю ведаў у працэсе атэстацыі навучэнцаў на іспытах. Значэнне і роля методыкі выкладання спецыяльных музычных дысцыплін у працэсе фарміравання педагагічнага і выканальніцкага майстэрства выкладчыка.

### *Тэма 2. Асноўная вучэбна-метадычная літаратура па спецыяльных дысцыплінах*

Станаўленне і развіццё методыкі выкладання спецыяльных музычных дысцыплін. Сувязь методыкі з гісторыяй выканальніцтва на музычным інструменце і гісторыяй музычнага мастацтва. Вывучэнне матэрыялаў аб правядзенні конкурсаў музычнага мастацтва, іх сутнасць і роля ў працэсе актывізацыі ажыццяўлення тэарэтычных даследаванняў аб выканальніцкіх сродках музыканта. Выкарыстанне прагрэсіўных методык у працэсе выкладання спецыяльных музычных дысцыплін.

Агляд сучаснай вучэбна-метадычнай літаратуры (у адпаведнасці з напрамкамі спецыяльнасці і спецыялізацыі).

Асноўныя вучэбна-метадычныя дапаможнікі. Структура і змест вучэбна-метадычных дапаможнікаў (школы ігры, хрэстаматыі, зборнікі педагагічнага і канцэртнага рэпертуару і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблемы фарміравання бібліятэчных фондаў спецыяльнай і нотнай літаратурай для духавых і ўдарных інструментаў у розных тыпах навучальных устаноў культуры і мастацтваў.

### *Тэма 3. Дыягностыка і метады развіцця музычных здольнасцей навучэнцаў*

Агульныя і спецыяльныя музычныя здольнасці. Музычны слых. Музычная памяць. Дыягностыка здольнасцей навучання на духавых інструментах у пачатковых навучальных установах. Асноўныя крытэрыі адбору навучэнцаў на духавых і ўдарных інструментах у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Развіццё рытмічнага пачуцця як арганізаванай паслядоўнасці музычных гучанняў рознай працягласці і паўз.

Метады вызначэння музычных здольнасцей. Выяўленне здольнасцей у працэсе музычнай дзейнасці.

Метады развіцця музычных здольнасцей у класе па адпаведных спецдысцыплінах.

Сістэма арганізацыі заняткаў і асаблівасці выкладання ў класе спецінструмента, дырыжыравання, аркестравага класа, класа інструментальнага ансамбля.

## Раздзел II. Тэхналагічныя аспекты навучання педагагічнаму і выканальніцкаму майстэрству

### *Тэма 4. Састаўныя кампаненты выканальніцкага апарату музыканта*

Выканальніцкі апарат музыканта як зыходная пастаноўка корпуса і рук музыканта. Агульныя прынцыпы пабудовы выканальніцкага апарату. Асноўныя заканамернасці работы мышцаў і анатама-фізіялагічная будова рук. Роля індывідуальных асаблівасцей вучня пры вызначэнні пастаноўкі.

Спецыфіка пасадкі, становішча інструмента і пастаноўка рук. Роля выканальніцкага апарату ў фарміраванні якаснага гучання інструмента. Паступовасць і паслядоўнасць у набыцці навыкаў ігры.

Методыка засваення ферматы, акцэнтаў, сінкоп і спосабы іх выражэння ў дырыжорскім жэсце. Асаблівасці выкарыстання дырыжорскай палачкі ў выканальніцкім працэсе (тэорыя, гісторыя, практыка). Методыка засваення разнавіднасцей штрыхоў і іх адлюстраванне ў дырыжорскім жэсце. Дынаміка і яе адлю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страванне ў дырыжорскім жэсце. Асноўныя метадычныя прынцыпы работы дырыжораў з партытурай. Метадычныя рэкамендацыі па выяўленні дырыжорам выбару схем тактавання.

### *Тэма 5. Методыка засваення асноўных мастацка выразных сродкаў музычнага выканальніцтва*

Дынаміка-акустычныя асаблівасці фарміравання гуку на духавых і ўдарных інструментах. Сродкі гуказдабывання на духавых і ўдарных інструментах. Слыхавы кантроль над гуказдабываннем і сувязь яго з музычна-мастацкім прадстаўленнем. Гукавая дынаміка, гукавыя дыяпазоны інструментаў. Тэмбравае фарбаванне гуку. Артыкуляцыйныя магчымасці выканаўцы ў працэсе засваення інструмента. Штрыхі і прыёмы гуказдабывання. Класіфікацыя штрыхоў. Асноўныя метады засваення і выкарыстання асноўнай і дадатковай аплікатуры.

Развіццё выканальніцкай тэхнікі ў аркестравым класе, класе спецінструмента, класе дырыжыравання, класе інструментальнага ансамбля і методыка работы над інструктыўным матэрыялам. Роля інструктыўнага матэрыялу для тэхнічнага і мастацкага развіцця музыканта.

### *Тэма 6. Методыка вывучэння і асаблівасці засваення вучэбнага і канцэртнага рэпертуару*

Методыка адбору, вывучэння, аналізу вучэбнага і канцэртнага рэпертуару (у адпаведнасці са спецыялізацыяй). Агульныя метадычныя прынцыпы адбору і сістэматызацыі рэпертуару ў аркестравым класе, класе спецінструмента, класе дырыжыравання, класе інструментальнага ансамбля. Творы розных стыляў і жанраў у вучэбным і канцэртным рэпертуары. Асноўныя прынцыпы інтэрпрэтацыі, пералажэння, інструментоўкі музычных твораў (выканальніцкія і метадычныя аспекты).

Методыка фарміравання канцэртнага рэпертуару як сродку выхавання выканальніцкага майстэрства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Асафьев, Б. В.* Избранные статьи о музыкальном просвещении и образовании / Б. В. Асафьев. – М. : Музыка, 1965. – 144 с.

2. *Ауэр, Л. С.* Моя школа игры на скрипке. Интерпретация произведений скрипичной классики / Л. С. Ауэр. – М. : Музыка, 1965. – 272 с.

3. *Багриновский, М.* Дирижерская техника рук : практ. рук-во к изучению основ мануальной техники дирижирования / М. Багриновский. – М. : Высшее училище военных дирижеров Советской Армии, 1947. – С. 24–33, 34–52, 19–131, 142–145, 202–209, 271–277.

4. *Баренбойм, Л. А.* Музыкальная педагогика и исполнительство / Л. А. Баренбойм. – М. : Музыка, 1974. – 336 с.

5. *Блох, О. А.* Музыкальное исполнительство и педагогика : учеб. пособие / О. А. Блох. – М. : МГУКИ, 2009. – 188 с.

6. *Благовещенский, И. В.* Некоторые вопросы музыкального искусства / И. В. Благовещенский. – Минск : Наука и техника, 1965. – 162 с.

7. *Браудо, И.* Артикуляция (О произношении мелодии) / И. Браудо. – 2-е изд. – М. : Музыка, 1973. – 198 с.

8. *Брянская, Ф.* Пособие по чтению нот с листа : в 2 ч. / Ф. Брянская, Л. Ефимова, С. Ляховицкая. – Л. : Музыка, 1964. – Ч. 1. – Л. : Музыка, 1969. – Ч. 2.

9. *Верхолаз, Р. К.* Вопросы методики чтения с листа / Р. К. Верхолаз. – М. : Госмузиздат, 1960. – 97 с.

10. *Вицинский, А. В.* Процесс работы пианиста-исполнителя над музыкальным произведением / А. В. Вицинский. – М. : Классика-XXI, 2004. – 98 с.

11. *Жилин, В. А.* Занимательные игры для чтения с листа (для любого инструмента) / В. А. Жилин. – М. : Музыка, 2005. – 56 с.

12. *Коган, Г. М.* У врат мастерства / Г. М. Коган. – М. : Классика-XXI, 2004. – 135 с.

13. *Коротеев, А. Л.* Актуальные проблемы методики работы с ансамблями и оркестрами духовых и ударных инструментов (профессиональные и любительские коллективы) / А. Л. Коротеев // Оркестр. – № 1. – 2005. – С. 11–13.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Коротеев, А. Л.* Взаимосвязь традиций народной педагогики и современных дидактических принципов в системе подготовки национальных музыкантов / А. Л. Коротеев // Социально-гуманитарные науки и устойчивое развитие белорусского общества : материалы Междунар. науч. конф., г. Минск, 9 дек. 2005 г. – Минск : БИП, 2005. – С. 236–237.

15. *Коротеев, А. Л.* Дисбаланс квалификационно-педагогических компонентов системы подготовки специалистов профессионального и любительского духового искусства Беларуси / А. Л. Коротеев // Проблемы развития педагогического образования : материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 17 дек. 2004 г. / Белорус. гос. пед. ун-т имени М. Танка ; редкол.: К. В. Гавриловец [и др.] ; отв. ред. А. В. Торхова, З. С. Курбыко. – Минск : БГПУ, 2005. – С. 375–377.

16. *Коротеев, А. Л.* Концептуально-содержательные аспекты психолого-педагогической подготовки специалистов духового музыкального искусства Беларуси / А. Л. Коротеев // Педагогическое образование в условиях трансформационных процессов: методология, теория, практика : материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 15–16 дек. 2005 г. / Белорус. гос. пед. ун-т имени М. Танка ; редкол.: И. И. Цыркун [и др.] ; отв. ред. А. В. Торхова, З. С. Курбыко. – Минск : БГПУ, 2005. – С. 86–87.

17. *Карацееў, А. Л.* Змест і практычная накіраванасць навучальна-творчага працэсу ў аркестры духавых інструментаў (арганізацыйна-метадычныя, мастацка-выканальніцкія аспекты работы аматарскага і прафесійнага калектыву) : навуч.-метад. дапам. / А. Л. Карацееў. – Мінск : МІК, 1993. – 27 с.

18. *Кузьмініч, М. Л.* Мастацкая творчасць / М. Л. Кузьмініч. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 142 с.

19. *Кудин, А. А.* Система подготовки дирижеров духовых оркестров Беларуси / А. А. Кудин // Оркестр. – 2005. – № 1. – С. 13–14.

20. *Маталаев, Л.* Основы дирижерской техники : метод. пособие / Л. Маталаев ; общ. ред. С. Скрипки. – М. : Сов. композитор, 1986. – 208 с. : ил., 1 л. ил.

21. *Мазанік, В. У.* Айчынная музыка : станаўленне дырыжорскай адукацыі / В. У. Мазанік // Асновы мастацтва. – 1997. – Вып. 9. – С. 54–62.

22. *Мусин, И.* Техника дирижирования : практ. рук-во / И. Мусин. – 2-е изд., доп. – СПб. : Деан – Адиа – М, 1995. – 295 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

23. *Ражников, В. Г.* Исследование музыкального исполнительского образа / В. Г. Ражников // Вопросы психологии. – 1978. – № 2. – С.70–80.
24. *Цыпин, Г.* Исполнитель и техника / Г. Цыпин. – М. : Музыка, 1999. – 192 с.
25. *Юзефович, В. А.* Беседы с Игорем Ойстрахом / В. А. Юзефович. – М. : Музыка, 1978. – 351 с.

*Дадатковая*

1. *Архангельский, И. П.* Организация духовых оркестров и обучение игре на духовых инструментах : метод. рекомендации для руководителей самодеятельных духовых оркестров и преподавателей ДМШ / И. П. Архангельский. – Минск : РМК : РНМЦ, 1981. – 69 с., 16 начальных коллективных упражнений.
2. *Блох, О. А.* Психология и педагогика музыкального творчества : учеб. пособие / О. А. Блох. – М. : МГУКИ, 2009. – 270 с.
3. *Волков, В. В.* Вопросы теории и практики исполнительства на трубе / В.В. Волков. – Минск: БГАМ, 1999. – 151 с.
4. *Волков, В. В.* Исполнительское дыхание (К вопросу о постановке техники дыхания при игре на медных духовых инструментах) / В. В. Волков // Весці Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2003. – № 4. – С. 84–88.
5. *Волков, В. В.* Некотрые вопросы исполнительства на трубе-piccolo / В. В. Волков // Весці Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2006. – № 9. – С. 93–100.
6. *Волков, В. В.* Техника игры на трубе в верхнем регистре : метод. рекомендации / В. В. Волков. – Минск : Респ. метод. кабинет по учебным зав. искусств, 1984. – 25 с.
7. *Волков, Н. М.* Работа над упражнениями и гаммами в классе трубы / Н. М. Волков. – Минск : Респ. метод. кабинет по учебным зав. искусств, 1983. – 39 с.
8. *Волков, Н. М.* Физические и психофизиологические предпосылки образования звука на трубе и проблемы исполнительской артикуляции / Н. М. Волков. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 2004. – 169 с.
9. *Волкаў, В. В.* Мастацка-выканальніцкія, метадычныя аспекты агульнагрупавых рэпетыцый трубачоў і карнетыстаў духавога аркестра / В. В. Волкаў // Асаблівасці дзейнасці аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў і ансамбляў на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры Беларусі : навуч.-метад. дапам. – Мінск : БУК, 1994. – С. 98–105.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Коротеев, А. Л.* Дифференциация самостоятельной работы в системе подготовки специалистов высшей квалификации духового, эстрадного искусства / А. Л. Коротеев // Шляхі павышэння эфектыўнасці кіруемай самастойнай работы студэнтаў : матэрыялы навук.-метад. канф., г. Мінск, 14 лют. 2008 г. / БДУКМ ; рэдкал.: Р. А. Ровіна (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – С. 99–107.

11. *Коротеев, А. Л.* Из истории оркестра Гомельской музыкальной школы (1830–1840 гг.) / А. Л. Коротеев // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. – Минск : Выш. шк., 1987. – Вып. 6. – С. 70–76.

12. *Коротеев, А. Л.* Произведения Д. Б. Кабалевского для детей и юношества и их роль в системе художественного образования исполнителей на трубе / А. Л. Коротеев // Материалы Всерос. науч.-практ. конф. «Художественное образование : инновации и традиции», 9–10 нояб. 2004 г. : в 2 ч. / Перм. гос. ин-т культуры и искусства [и др.]. – Пермь, 2004. – Ч. 1. – С. 80–86.

13. *Коротеев, А. Л.* Работа над упражнениями, гаммами и этюдами как обязательное условие развития исполнительского мастерства (медные духовые инструменты : труба, корнет, альт горн, тенор горн, баритон горн) : метод. указания с нотными примерами / А. Л. Коротеев. – Минск : Минск. ин-т культуры, 1986. – 40 с.

14. *Коротеев, А. Л.* Самостоятельные ежедневные упражнения на специнструменте как составная часть учебного процесса (медные духовые инструменты: труба, корнет, альт горн, тенор горн, баритон горн) : метод. указания с нотными примерами / А. Л. Коротеев. – Изд. 2-е. – Минск : Минск. ин-т культуры, 1985. – 36 с.

15. *Корыхалова, Н. П.* Музыкально-исполнительские термины : возникновение, развитие значений и их оттенки, использование в разных стилях / Н. П. Корыхалова. – СПб. : Композитор, 2000. – 272 с. : нот.

16. *Караткевіч, А. А.* Педальныя гукі ў сістэме штодзённых самастойных заняткаў трубача : вучэб. матэрыял / А. А. Караткевіч. – Мінск : БУК, 1977. – 17 с.

17. *Караткевіч, А. А.* Развіццё асноўных выканаўчых навыкаў на пачатковым этапе навучання ігры на трубе / А. А. Караткевіч // Праблема ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі : тэзісы дакладаў на навук.-метад. канф., 2–3 лют. 1995 г. – Мінск : БУК, 1995. – 37 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18. *Карацееў, А. Л.* Забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ культуры і мастацтваў Беларусі (вучэбна-метадычныя і арганізацыйныя аспекты) / А. Л. Карацееў // Кафедра як асноўны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў да дзейнасці ў сацыякультурнай і інфармацыйна-камунікатыўнай сферах : матэрыялы навук.-метад. канф., 19–20 лют. 2004 г. / рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 51–54.

19. *Карацееў, А. Л.* Калі конкурс – сапраўднае свята... / А. Л. Карацееў // Мастацтва. – 1997. – № 3. – С. 43–45.

20. *Карацееў, А. Л.* Роля прагрэсіўных тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў працэсе распрацоўкі сучасных адукацыйных стандартаў / А. Л. Карацееў // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі : тэарэтыка-метадалагічныя аспекты: матэрыялы навук.-метад. канф., 2–3 лют. 1999 г. – Мінск: Беларус. ун-т культуры, 1999. – С. 91–96.

21. *Мангушаў, І. А.* Праблемы навучання гукаўтварэнню, штрыхам на медных духавых інструментах удзельнікаў аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў / І. А. Мангушаў // Асаблівасці дзейнасці аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў і ансамбляў на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры Беларусі : навуч.-метад. дапам. – Мінск : БУК, 1994. – С. 22–25.

22. *Мангушев, И. А.* Ступени мастерства трубача: учеб.-метод. пособие / И. А. Мангушев ; вступ. ст. А. Л. Коротеева. – Минск : БелГИПК, 2001. – 68 с. : нот. ил.

23. *Сигети, Ж.* Воспоминания. Заметки скрипача / Ж. Сигети. – М. : Музыка, 1969. – 306 с.

24. *Стромов, Ю. А.* Путь актера к творческому перевоплощению / Ю. А. Стромов. – М. : Просвещение, 1975. – 80 с.

25. *Степурко, О.* Трубач в джазе / О. Степурко. – М. : Сов. композитор, 1989. – 207 с.

26. *Табаков, М. И.* Ежедневные упражнения для трубы / М. И. Табаков. – М. ; Л. : Музыка, 1952. – 30 с.

27. *Холопова, В.* Вопросы ритма в творчестве композиторов XX века / В. Холопова. – М. : Музыка, 1971. – 304 с.

28. *Усов, Ю. А.* Методика обучения игре на трубе / Ю. А. Усов. – М. : Музыка, 1984. – 215 с.

29. *Усов, Ю. А.* Техника современного трубача (ежедневные упражнения) / Ю. А. Усов. – М. : Музыка, 1986. – 86 с.

30. *Яконюк, В. Л.* Музыкант. Потребность. Деятельность / В. Л. Яконюк. – Минск : Белорус. акад. музыки, 1993. – 147 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Балы | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам тэрміналогіі, асобных фактаў, з'яў, крытэрыяў і форм кантролю вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца педагагічнай кваліфікацыі і культуры выкладчыка ў сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы, шляхоў і сродкаў засваення педагагічнага майстэрства ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці). Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля вучэбна-выхаваўчага працэсу па навучанні спецыфіцы музычнага мастацтва; сістэмы музычнай адукацыі па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах; веданне асноўных форм і метадаў засваення музычнага мастацтва ў вучэбных установах розных тыпаў і г.д.). Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Трывалыя веды па асноўных кірунках падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах, раскрыцці праблем музычнай адукацыі ў сучасных умовах развіцця культуры. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 8 (восем) | Дастатковыя веды па асноўных кірунках падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне асабістых вывадаў канкрэтнымі прыкладамі з вопыту работы выкладчыкаў вучэбных устаноў розных тыпаў.<br>Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па спецыяльных дысцыплінах. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Трывалыя веды па асноўных кірунках падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Усведамленне студэнтам вучэбна-педагагічнага працэсу ў вучэбных установах розных тыпаў, асэнсаванне вопыту вядучых спецыялістаў-выкладчыкаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць формы і метады арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў вучэбных установах розных тыпаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах, карыстацца вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратурай па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Поўныя, трывалыя і глыбокія веды па асноўных кірунках падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Глыбокае асэнсаванне праблем музычнага выхавання і навучання выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай педагагічнай дзейнасці па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах, аналізаваць праблемы, якія існуюць у практыцы навучальных устаноў. Кваліфікаванае карыстанне вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратурай па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні. Адсутнасць памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– састаўленне варыянтаў індывідуальнага плана работы выкладчыка навучальнай установы па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах;

– састаўленне варыянтаў індывідуальных планаў навучэнцаў навучальных устаноў па засваенні выканальніцкіх навыкаў на духавых і ўдарных інструментах;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– франтальнае вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па тэмах дысцыпліны.

*Вучэбнае выданне*

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06-11*
*Духавыя інструменты (народныя);*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02*
*Інструментальная музыка духавая*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,03. Ул.-выд. арк. 0,70. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ